©ПГУ

# НАРОДНАЕ ТКАЦТВА МЯДЗЕЛЬШЧЫНЫ КАНЦА XIX – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX стст.

***Э. І. МІСЕВІЧ***, **У. А. ЛОБАЧ**

The traditional method of processing and weaving, products, matherials for these processes in Myadel region at end of XIX – p.p. the XX century are discussed in this article

Ключавыя словы: ткацтва, Мядзельшчына, прасніца, калаўрот, кросны

Ткацтва адлюстроўвае гаспадарчую дейнасць народа, яго сацыяльны стан, прыналежнасць да вызначанай этнічнай групы і ў пэўнай меры з’яўляецца паказальнікам узроўню культуры народа на вызначаным гістарычным этапе яго развіцця [1, с. 16].

Найбольшае пашырэнне, як сыравіна для ткацтва на Мядзельшчыне набыў лён, яго вырошчвалі амаль у кожнай гаспадарцы. Толькі ў сяр. XX ст. назіраўся заняпад у вытворчасці тканіны ў хатніх умовах. Працэс вымушанай калектывізацыі аказаў значны ўплыў на лёс традыцыйнага ткацтва.

У канцы XIX і асабліва ў пачатку XX ст. апрача лёну і воўны ў хатнім ткацтве, у прыватнасці для вырабу тканін для жаночага паяснога адзення, а таксама дэкаратыўных ручнікоў, даволі часта выкарыстоўваліся фабрычныя ніткі. Льняным ці шарсцяным з’яўляўся толькі ўток [2, с. 323].

Прылады для апрацоўкі лёны мелі рэгіянальныя канструкцыйныя асаблівасці. Для Мядзельшчыны характэрна: гарызантальная двухрэберная мялка, трапло мечападобнай формы, калаўрот-стаяк, прасніца лапатападобнай формы з днішчам.

Ткацтва было справай нялёгкай, аблытанай павер'ямі, забабонамі, прыкметамі, патрабавала шмат часу, практычных навыкаў, умельства. Дзяўчынак вучылі ткаць з 7–8 гадоў.

Нават у асартыменце назіраецца лакальная асаблівасць, характэрная для Мядзельшчыны ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі рэспублікі. Тут ткуць больш посцілкі, дываны [3, с. 493].

Паводле класіфікацыі Вольгі Лабачэўскай, ручнікі дадзенага рэгіёну адносяцца да Вілейска-мядзельскіх ручнікоў. Яны ўяўляюць сабой разнавіднасць арэальнага тыпу шматнітовага ручніка, характэрнага для Віленшчыны. Вылучаюцца выкарыстаннем складаных прыёмаў ткання на 8, 10, 12 і 16 нітах [4, с. 186]. Для арнаменту характэрны буйныя геаметрычныя матывы ў выглядзе разетак, кругоў, авалаў, квадратаў, якія складзены ўнутры з невялічкіх слупкоў. Арнамент на тканіне чытаіцца па абодва бакі, што дазваляе утылітарна выкарыстоўваць ручнік, павялічвае дэкаратыўныя якасці шматнітовых ручніковых тканін, робіць іх самадастатковымі ў мастацкіх адносінах.

У пачатку XX стагоддзя народнае, хатняе ткацтва скарацілася. Пачало пераважаць ткацтва тканін дэкаратыўнага прызначэння – посцілкі, дываны, ручнікі, фіранкі [5, с. 92–93]. Яно прыкметна залежыла і ад бытавой сітуацыі. Распаўсюджнне ў 2-й палове XIX ст. печаў з комінам спрыяла павелічэнню памераў вокнаў, гэта ў сваю чаргу садзейнічала з'яўленню новых, нетрадыцыйных тканых вырабаў – фіранак.

Тэма комплекснага даследвання народнага ткацтва беларусаў і надалей застаецца перспектыўнай для этналагічнага і культуралагічнага вывучэння.

**Літаратура**


1. *Курилович, А.Н.* Белорусское народное ткачество / А.Н. Курилович – Мн.: Наука и техника, 1981. -119 с.: ил.
2. *Бандарчык, В.К., Пілiпенка М.Ф., Цітоў В. С.* Беларусы: У 8 т. Т. 1: Прамысловыя і рамесныя заняткі – Мн.: Навука і тэхніка, 1995 – 351 с.: іл.
3. *Памяць:* Гіст. – дакум. Хроніка Мядзельскага раёна. – Мн.: П15 Беларуская Энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі, 1998. – 640 с.:іл.
4. *Лабачэўская, В.А.* Альбом. Повязь часоў – беларускі ручнік / В.А. Лабачэўская – Мн.: Беларусь, 2002 – 229 с.: іл.
5. *Навагродскі, Т.А.* Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве; вучэб.-метад. дапам. / Т.А. Навагродскі – Мн.: БДУ, 2009. – 335 с.: іл.